УДК 93/99

В.М. Тамашэвіч

# З гісторыі II з'езда сіяністаў Расіі

II з'езд сіяністаў Расіі, праведзены ў Мінску 22-28 жніўня (4-10 верасня) 1902 г., стаў важнай з'явай у грамадска-палітычным жыцці Расійскай Імперыі. З'езд атрымаў шырокія водгукі ў яўрэйскім і рускім друку, з'явіўся прэцэдэнтам у практыцы далейшай сіяніскай дзейнасці, асабліва ў перыяд яе абмежавання і забароны з боку ўрада.

У сіяніскім руху напярэдадні мінскага з'езда назіраўся крызіс, выкліканы палітыка-дыпламатычнай дзейнасцю заснавальніка палітычнага сіянізму Тэадора Герцля. Ён лічыў галоўнай задачай сіяніскага руху палітычную дзейнасць, накіраваную на атрыманне «чартэра», гэта значыць, зацверджанага Турцыяй законнага права яўрэяў на масавае засяленне Палесціны. Няўдачы Т. Герцля ў гэтым напрамку, рост антысемітызму ў Расійскай Імперыі садзейнічалі ўтварэнню апазіцыйнай у адносінах да Т. Герцля групы ў Сусветнай сіяніскай арганізацыі. Гэта група атрымала назву «маладой» ці «дэмакратычнай» фракцыі. Яна ўзнікла сярод маладых расійскіх сіяністаў і некаторых сіяніскіх дзеячаў з заходніх краін напярэдадні V сіяніскага кангрэса, які адбыўся ў Базэле ў 1901 г. Лідэрамі «дэмакратычнай фракцыі» былі Л. Моцкін, Х. Вейцман, Я. Бернштэйн-Коган, М. Бубер. Акрамя крытыкі знешнепалітычнай дзейнасці Т. Герцля, яны былі не задаволены яго прыярытэтнымі адносінамі да рэлігійных колаў у параўнанні са свецкімі. У сваю чаргу рэлігійныя дзеячы змагаліся супраць работы ў галіне свецкай яўрэйскай культуры.

Падобнае супрацьстаянне па пытаннях культуры і практычнай дзейнасці паміж свецкімі і рэлігійнымі коламі знайшло сваё адлюстраванне і ў дзейнасці з'езда расійскіх сіяністаў у Мінску. Аднак рашэнні, прынятыя на з'ездзе, сведчаць аб імкненні расійскіх сіяністаў пераадолець рознагалоссі і быць адзінай моцнай сіяніскай арганізацыяй.

Амаль нічога не вядома пра месца правядзення з'езда – ёсць толькі ўпамінанне ў газеце «Новости», што з'езд праходзіў у зале «Парыж» [1], аднак адсутнічае дакладны адрас месцазнаходжання гэтай залы. Ёсць розныя звесткі аб колькасці ўдзельнікаў з'езда. У газеце «Восход» адзначалася, што на мінскі з'езд з'явілася крыху менш чым 500 дэлегатаў, прадстаўнікоў прэсы было каля 40, гасцей – 200 [1, л. 72]. Іншыя даныя сведчаць аб тым, што на мінскім з'ездзе было больш за 500 удзельнікаў [2].

Мінскі з'езд расійскіх сіяністаў цікавы і тым, што ён быў першым са з'ездаў сіяністаў у Расіі, які атрымаў афіцыйны дазвол на такое мерапрыемства ад міністра ўнутраных спраў В.К. Плеве, вядомага сваёй антысеміцкай накіраванасцю. Дазвол на правядзенне з'езда, атрыманы ў канцы чэрвеня [2, с. 122], стаў вынікам дваякіх адносін рускага ўрада да сіяніскага руху. «З аднаго боку, гэты рух быў безумоўнай праявай грамадска-палітычнай і нацыянальнай актыўнасці менавіта той часткі насельніцтва, якая заўсёды лічылася найменш надзейным элементам у імперыі. З другога боку – гэта быў даволі ўдалы шлях вырашэння яўрэйскага пытання» [3].

Да прыняцця цыркуляра МУС ад 24 чэрвеня 1903 г. аб забароне сіянісцкай дзейнасці, выкліканай уздымам культурнай і нацыянальна-выхаваўчай дзейнасці ў сіянісцкіх гуртках, замест чакаемай расійскім урадам работы па эміграцыі яўрэяў з імперыі ўрад праяўляў няўпэўненасць у сваіх адносінах да сіяністаў, прыглядаўся да іх, вывучаў сабраную Дэпартаментам паліцыі МУС інфармацыю.

Цікавы той факт, што ў Дэпартаменце паліцыі адсутнічалі звесткі аб дазволе сіяністам праводзіць у Мінску з'езд. У дакументах, вызначаных 1915 г., можна знайсці перапіску паміж 4 і 9-м справаводствамі Дэпартамента паліцыі наконт мінскага з'езда 1902 г. 4-е справаводства прасіла 9-е паведаміць як мага хутчэй, ці быў дазвол урада на правядзенне ў 1902 г. «Усерасійскага з'езда сіяністаў» у Мінску, або адаслаць справу адносна гэтага з'езда [1, л. 212], на што 9-е справаводства дало адказ 4-му, што «...звестак аб тым, ці быў дазволены ўрадам у 1902 г. Усерасійскі з'езд сіяністаў у Мінску, няма» [1, л. 216].

На з'ездзе ці, як адзначалася, на візітных картках дэлегатаў, на «Усерасійскім кангрэсе сіяністаў у Мінску» [1, л. 59] дэпутаты прадстаўлялі сабой розныя накірункі сіянізму – «Мізрахі» (рэлігійныя артадоксы) – па некаторых даных, іх было 160 чалавек; «дэмакратычная фракцыя» (лібералы) – каля 60 чалавек; умераныя – каля 120 дэлегатаў [1, л. 64] і «незалежныя». Вельмі цікавы той факт, што прадстаўніцай ковенскіх сіяністаў на з'ездзе ў Мінску была Хемда Бен-Іегуда, жонка выдатнага вучонага Э. Бен-Іегуды з Іерусаліма, заснавальніка «жывога» іўрыта. Разам з мужам яна выдавала ў Іерусаліме газету «Haschkafa», а на мінскі з'езд Хемдай быў падрыхтаваны даклад аб палесцінскіх каланістах.

Адказнасць за арганізацыю з'езда была ўскладзена на доктара Грыгорыя (Цві) Брука, упаўнаважанага па Віцебскай губерні, да якой тады адносіўся Мінск, а таксама на адваката Шымшона Разенбаума як прадстаўніка мінскіх сіяністаў [2, с. 122].

З уступным словам на кангрэсе выступіў доктар Г. Брук. Ён указаў на тое, што гэты кангрэс сабраў актыўных барацьбітоў сіянізму дзеля абмеркавання шляхоў адраджэння яўрэйскага народа. Па словах Г. Брука, за чатыры гады свайго існавання сіянісцкі рух спасціг вялікі поспех, які выражаўся галоўным чынам у прыкметным уздыме нацыянальнай свядомасці. Г. Брук таксама прачытаў тэлеграму ад доктара Т. Герцля з пажаданнямі поспеху гэтаму кангрэсу [1, л. 60]. Было выбрана Бюро кангрэса, старшыня кангрэса – І. Членаў, відны дзеяч расійскіх сіяністаў, і яго намеснікі – М. Усышкін, Разенбаум і Ясіноўскі.

У праграму з'езда былі ўключаны пытанні аб справаздачы інфармацыйнага бюро і фінансавага цэнтра, нацыянальнага зямельнага фонду, аб каланіяльным Банку, нацыянальным выхаванні і адукацыі, эканамічных цяжкасцях, пасяленчай палітыцы, метадах прапаганды.

Па звестках газеты «Свет», «колькасць расійскіх сіяністаў на момант з'езда вызначалася ў 300 тыс. чалавек, у грошах гэта выражалася па 40 к. з душы (*кошт так званага «шэкеля».*– В. Т.), гэта значыць 120 тыс. р. у год» [1, л. 68].

Справаздача фінансавага цэнтра, які знаходзіўся пад увагай доктара М. Мандэльштама з Кіева, таксама сведчыла пра значныя фінансавыя паступленні расійскіх сіяністаў: напярэдадні з'езда за ліпень паступіла больш за 5 тыс. р., за жнівень (па 19-е) – каля 4 тыс. р., а 20 жніўня, у дзень выезду ў Мінск дэлегата-дакладчыка аб фінансавым цэнтры, паступіла каля 1 тыс. р., гэта значыць, прыход усё больш і больш павялічваўся [1, л. 61].

Павелічэнне фінансавых паступленняў расійскіх сіяністаў сведчыла аб іх імкненні стаць уплывовай фракцыяй на сусветных сіянісцкіх кангрэсах.

У цэнтры ўвагі дэлегатаў на мінскім з'ездзе знаходзіліся пытанні культурнай работы. Дэпутаты «Мізрахі» выступалі супраць культурнай дзейнасці сусветнай арганізацыі і патрабавалі перайсці да практычнай дзейнасці ў Палесціне з дапамогай Яўрэйскага Нацыянальнага Фонду і Яўрэйскага Каланіяльнага Банка. «Дэмакратычная фракцыя» прапаноўвала асветніцкія і прапагандысцкія задачы, накіраваныя на развіццё іўрыта, нацыянальнай гісторыі і самасвядомасці.

Ужо на V сусветным кангрэсе сіяністаў у Базэле ў 1901 г. было прызнана, што «адзіны канкрэтны вынік сіянісцкага руху праявіўся не па прамой лініі палітыкі, а на ўскосных шляхах нацыянальна-культурнай работы на месцах – ва ўзмацненні зацікаўленасці да народнага жыцця сярод адарваных груп інтэлігенцыі і моладзі, у заснаванні нацыянальных школ, вывучэнні нацыянальнай мовы і гісторыі, прыкметным ажыўленні літаратуры – наогул, у творчай рабоце па-за Сіёнам, але сярод яўрэйства» [3, с. 98].

Каб пазбегнуць расколу сярод расійскага сіянізму, мінскі з'езд прымае рашэнне стварыць два камітэты па справах яўрэйскай адукацыі: традыцыйны і свецкі, а таксама выбраць дзве камісіі, якія будуць працаваць самастойна і незалежна адна ад другой.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі*** (ДАРФ), ф. 102 ДПАА, воп. 236, спр. 11, ч. 2, т. 2(1), л. 60.
2. ***Маор И.*** Сионистское движение в России. Иерусалим, 1977.
3. ***Рахманова Н.*** Еврейский вопрос в политике В. К. Плеве // Вестник Еврейского Университета в Москве. М., 1995, № 1(8). С. 83-103.



## SUMMARY

*The Second congress of Russian Zionists in Minsk (1902) was the great event in social and political life of the Russian Empire. The author considers the history of the congress in the context of the Zionist and world history. The article is based on new materials of the State archive of Russian Federation.*



*Поступила в редакцию 15.01.2003*